*УДК 398.332.2(476.2-37Ветка)*

**П. М. Пархоменка**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# АБРАД ПАХАВАННЯ СТРАЛЫ Ў ВЁСЦЫ СТАРОЕ СЯЛО ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*У артыкуле, прысвечаным характарыстыцы мясцовай спецыфікі абраду пахавання стралы ў в. Старое Сяло Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці, выкарыстаны як апублікаваныя, так і ўласна запісаныя матэрыялы. Аўтар выяўляе адметныя рысы абраду пахавання стралы, якія назіраюцца як на ўзроўні абрадавых дзеянняў, так і адпаведных песень.*

Абрад пахавання стралы – адзін з самых старажытных абрадаў Беларусі, які захаваўся да нашых дзён на тэрыторыі Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці ў такіх вёсках, як Стаўбун, Казацкія Балсуны, Неглюбка, Пералёўка і інш. Як адзначыла даследчыца В. С. Новак, «абрад пахавання стралы – спецыфічная адметнасць веснавой каляндарна-абрадавай паэзіі беларусаў, гэта рэгіянальная з'ява, бо прэтэндуе на пэўную самастойнасць, аўтаномнасць. У гэтым плане як адметная з'ява веснавога абрадавага фальклору Гомельшчыны адрозніваецца ад агульнабеларускай фальклорнай традыцыі» [1, с. 29].

Арыгінальнай з'явай каляндарна-абрадавага фальклору ў в. Старое Сяло з'яўляўся абрад пахавання стралы, які меў назву «*Сена*». Засяродзім спачатку ўвагу на тым, як адбываўся абрад ў гэтай вёсцы. Зыходзячы з успамінаў маёй бабулі, Пілігузавай Лідзіі Васільеўны, 1957 г. н., абрад пахавання стралы ў в. Старое Сяло праводзіўся на другі дзень Вялікадня: «Казалі, што гэты абрад "хавае" вясну і "выпускае" лета. Абрад праводзілі з душой, таму што, лічылася, ён садзейнічаў росту зернавых, ахоўваў ураджай і людзей ад навальніц з градам і засухі» (запісана ў в. Старое Сяло ад Пілігузавай Лідзіі Васільеўны, 1957 г. н.).

У в. Пералёўка, дзе даводзілася бываць інфарманту, пачынаўся абрад на Ушэсце раніцай у хаце таго жыхара, у якога «Свяча» захоўвалася на працягу года. Яе яшчэ называлі «аброчнай свячой». Як правіла, яе ставілі на куце пад абразамі і была яна апранутая ў прыгожае «плацце». «Кожны, хто прыходзіў у хату, прыносіў да яе свае свечкі, грошы, пачастункі. Пасля калектыўна праведзенага малебена ўсіх запрашалі за трапезны стол. А потым жыхары вёскі, у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

асноўным жанчыны і дзеці, накіроўваліся ў цэнтр вёскі, да крамы, дзе ўсе жыхары збіраліся, каб ісці вадзіць стралу» (запісана ў в. Старое Сяло ад Пілігузавай Лідзіі Васільеўны, 1957 г. н.).

Паводле ўспамінаў Пілігузавай Лідзіі Васільеўны, 1957 г. н., калісьці там, «каля крамы ў вёсцы Пералёўка, на скрыжаванні дарог, раслі два вялізныя дубы. Вось там і збіраліся не толькі мясцовыя жыхары, але прыязджалі і з суседніх вёсак. Усе разам вадзілі карагоды, спявалі песні. Даводзілася і мне разам з матуляй кожны год прысутнічаць на гэтым маляўнічым свяце».

Інфармант прыгадвала, што, калі вадзілі карагод у в. Старое Сяло, то спявалі песню «Як пушчу стралу…»:

*Як пушчу стралу да й па ўсяму сялу.*
*Паляцела страла, праз усё сяло*
*Да й убіла страла добра молайца.*
*Па тым молайцу плакаць некаму:*
*Матка – старэнька, а сястра – маленька,*
*А жана малада, як спела ягада.*
*Дзе матка плача, там рака цячэ.*
*Дзе сястра плача, там возера.*
*Дзе ўдава плача, там крынічка.*
*Дзе дзеткі плачуць, там ручайкі цякуць* (запісана ў в. Старое Сяло ад Пілігузавай Лідзіі Васільеўны, 1957 г. н.).

Зыходзячы з успамінаў іншых жыхароў вёскі, «гэты звычай існуе ў нас для таго, каб у новым годзе расло новае, харошае сена. Збіраюцца людзі з аднаго краю вёскі і з другога і ідуць адны насустрач другім да сярэдзіны сяла. Мужчыны бяруць косы, вілы, ідуць першымі, жанчыны бяруць граблі» (в. Старое Сяло) [1, с. 108]. Як вынікае з фактычнага матэрыялу, групы людзей, якія знаходзяцца ў розных баках вёскі, выконваюць розныя песні пад назвамі «Страла» і «На сена» (в. Старое Сяло) [1, с. 108-109].

Пасля ваджэння карагодаў усе адпраўляліся да жытнёвага поля, каб на ўскрайку «закапаць стралу». Выходзілі самыя старэйшыя жанчыны і вадзілі карагод на ніве. Выбіраліся тры самыя высокія каласкі і звязваліся стужкай. Пад каласкамі вырывалі ямку ў выглядзе крыжа. У гэту ямку людзі апускалі гузікі, капейкі і загадвалі розныя жаданні. Пры гэтым прыгаворвалі: «Прымі зямелька грошы, а нам дай ураджай харошы». У народзе лічылася, што гэтыя дзеянні прывядуць да добрага ўраджаю. У час «пахавання стралы» дзеці і жанчыны качаліся па полі з каласамі, каб ніва была такая ж вялікая, як і яны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пахаванне стралы асэнсоўвалася ў дадзеным выпадку як развітанне з вясною, невыпадкова ляльку, якую закопвалі, называлі «вясна». Пасля таго, як правялі цырымонію пахавання «лялькі вясны», вадзілі карагоды, абходзячы вёску і выконваючы песню:

*Ой хрэн, ты, мой хрэн, садавы, яравы.*
*Ці не я цябе садзіў, ці не я паліваў?*
*Селівонава жана пры дарозе жыла,*
*Русу косу часала, прыгаварывала:*
*«Ой расці, мая каса, да самога паяса,*
*Да самога паяса, да шырока сапага».*
*Як ехалі баяры сямі горад гарадамі,*
*Як увідзелі дзяўчонку,*
*Панаравілась, разрумянілась,*
*Ой, румяна, румяна.*
*Ой, бялява, бялява* (запісана ў в. Старое Сяло ад Пілігузавай Лідзіі Васільеўны, 1957 г. н.).

Потым праходзіў заключны карагод, пасля якога кожная жанчына зрывала дзевяць жытнёвых каласкоў і несла іх дадому. Гаварылі, што гэтыя каласкі маюць ахоўную магічную сілу. Тры каласкі абавязкова падвешвалі пад страху ў хляве, каб засцерагчы жывёлу ад хвароб. Тры каласкі трэба было размясціць пад столлю ў дзіцячым пакоі, каб яны засцерагалі дзяцей ад сурокаў і розных хвароб. А тры каласкі клалі за абразамі, каб зберагалі хату ад маланкі, грому і злосных людзей.

Зараз мала жанчын засталося ў вёсцы, якія дасканала ведаюць абрад пахавання стралы, але яны імкнуцца перадаць свае веды маладзейшым. Трэба ведаць сваё мінулае і помніць пра абрады, якія здаўна прыйшлі да нас. Гэта наша жыццё, наша гісторыя, наша памяць.

Сярод адметных мясцовых рысаў абраду пахавання стралы ў в. Старое Сяло Веткаўскага раёна варта вылучыць такі момант, як жартоўны «паядынак» паміж групамі, што водзяць карагоды: «А потым сустракаюцца і пачынаюць у жарт біцца, а тады размінаюцца і мяняюцца месцамі – гэтыя ідуць у той край, а тыя – у другі і пяюць тыя самыя песні. Абходзяць кругом вёскі і на тым жа месцы сустракаюцца. Там ужо танцы. Танцуюць спачатку «хрэна» і прыпяваюць: «Ой, хрэн, ты мой хрэн, яравой, садавой» [1, с. 110-111].

На пытанне, з якой мэтай водзяць сёння абрад пахавання стралы, інфарманты адказвалі, што гэта свята яднання аднавяскоўцаў з прыродай, роднай зямелькай і сонцам. Жыхары ідуць у поле, каб заклікаць ўрадлівыя дажджы, адвесці маланку ад вёскі і падзякаваць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Богу за жыццё, якое ён ім падараваў. Прыведзеныя звесткі дапаўняюць вядомыя матэрыялы па абраднасці пахавання стралы і пераконваюць, што невыпадкова гэта арыгінальная абрадавая з'ява была ўключана ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей нашай краіны.

**Спіс літаратуры**

1 Новак, В. С. Абраднасць і паэзія «пахавання стралы» / В. С. Новак. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2002. – 269 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ